Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №6(57), 2009

*УДК 947: 329.14 “1903/1917” Ленин*

# Ідэя самавызначэння народаў у ленінскай палітычнай канцэпцыі ў дакастрычніцкі перыяд

Р. Р. Лазько

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Бальшавікі вялі барацьбу за ўладу ў шматнацыянальнай краіне, у якой пануючая нацыя – рускія – складалі меншасць насельніцтва (каля 43%). Гэта быў такі фактар унутранага жыцця краіны, які не магла праігнараваць ні адна агульнарасійская палітычная партыя, і тым болей такая, як РСДРП, меўшая амбіцыйныя планы карэннага сацыяльна-палітычнага пераўтварэння Расіі. Таму Ленін, прэтэндаваўшы на лідэрства ў партыі з часу яе стварэння, задоўга да Кастрычніцкай рэвалюцыі паставіў у цэнтр сваёй увагі гэту асаблівасць нацыянальнага складу краіны. Адначасова ён улічваў іншыя яго істотныя асаблівасці: тое, што прыгнечаныя нацыянальнасці насяляюць пераважна ўскраіны Расійскай імперыі, значная іх частка знаходзіцца на больш высокім узроўні развіцця ў параўнанні з пануючай нацыяй, але пры гэтым вымушаны жыць у дзяржаве, “дзе палітычны лад адрозніваецца асабліва варварскім і сярэдневечным характарам” [1, с. 66, 271; 2, с. 252 – 266]. Дадамо да гэтай характарыстыкі, што ўспрыняцце народамі заходніх ускраін імперыі свайго драматычнага становішча абвастралася суседствам з больш развітымі дзяржавамі, а ў шэрагу выпадкаў (фіны, палякі, украінцы) і наяўнасцю за мяжой роднасных этнасаў, меўшых там лепшыя ўмовы для існавання. Гэтыя абставіны парадзілі цэнтрабежную тэндэнцыю ў палітычным развіцці народаў заходніх ускраін, якая ў спрыяльных умовах, створаных тым ці іншым сур’ёзным крызісам расійскай дзяржаўнасці, магла прывесці да адрыву ад яе гэтых ускраін. Такі крызіс, як вядома, наступіў у гады першай сусветнай вайны.

Ленін, як і ў цэлым кіраўніцтва бальшавіцкай партыі як партыі агульнарасійскай, натуральна, не маглі жадаць сабе гэтай перспектывы – звужэння сферы сваёй палітычнай дзейнасці, а верагодна – і сферы палітычнай улады ў выніку змяншэння тэрыторыі і ўсіх рэсурсаў краіны. Ленін не аднойчы падкрэсліваў перавагі барацьбы рабочага класа “на як мага больш шырокай арэне”, якую ўяўляюць буйныя дзяржавы [3, с. 105; 4, с. 328; 2, с. 255], і выступаў супраць іх драблення. Аднак не перспектыва драблення расійскай дзяржавы, ці, дакладней, не яна сама па сабе прымушала бальшавікоў шукаць рашэння нацыянальнай праблемы ў Расіі да таго, як пачнецца яе распад. Імкненне прадухіліць гэту перспектыву было толькі адным з элементаў іх палітычнай ідэалогіі як рэвалюцыйнай партыі, партыі паслядоўнікаў Маркса і Энгельса, якая імкнулася ахапіць сваімі ўплывамі ўвесь расійскі рабочы клас. А Маркс і Энгельс сцвярджалі яшчэ ў “Маніфесце Камуністычнай партыі”, што “рабочыя не маюць сваёй айчыны”, затое ў выніку камуністычнай рэвалюцыі яны “набудуць увесь свет” [5, с. 441]. Як бы ні ставіцца да першага з прыведзеных выказванняў стваральнікаў марксізма (“рабочыя не маюць айчыны”), аднак відавочна, што для Маркса і Энгельса часу іх “Маніфеста” барацьба рабочых за нацыянальныя інтарэсы была толькі крокам на шляху да заваявання імі “ўсяго свету” – гэта значыць да ўстанаўлення сусветнай сістэмы сацыялізма. Інакш гаворачы, яна была сродкам фарміравання і загартоўкі рэвалюцыйнай арміі, сродкам стварэння для яе ўмоў, спрыяючых барацьбе за канчатковую мэту – за сусветны сацыялізм. Змагаючыся за мэты сённяшняга дня, падкрэслівалі Маркс і Энгельс, камуністы “ў той жа час… адстойваюць і будучыню руху” [5, с. 458].

Пазней, абапіраючыся на больш багаты вопыт нацыянальнага і рабочага руху, Энгельс вышэй узняў значэнне барацьбы супраць нацыянальнага ўціску, прызнаўшы яе самастойны характар.У адным з лістоў да К. Каўцкага ён пісаў, што “знішчэнне нацыянальнага прыгнёту з’яўляецца асноўнай умовай любога здаровага і свабоднага развіцця”, бо дзеля таго, “каб

мець магчымасць змагацца, патрэбны спачатку грунт пад нагамі, паветра, святло і прастор. Інакш усё – балбатня" [6, с. 221]. Для Энгельса такім грунтам пад нагамі была менавіта нацыянальная дзяржава.

Ленін, распрацоўваючы праграму РСДРП па нацыянальным пытанні, як і ў іншых пытаннях марксісцкай тэорыі і практыкі, схіляўся да ранніх поглядаў класікаў марксізма. Ён разумеў, што нацыянальны ўціск стрымлівае ўступленне рабочага класа прыгнечаных нацый салідарна з рускімі рабочымі ў барацьбу за класавыя інтарэсы, у перспектыве – за сусветную сацыялістычную рэспубліку. Аднак, у адрозненне ад Энгельса, ён не праяўляў схільнасці разглядаць стварэнне самастойных нацыянальных дзяржаў як аб'ектыўную папярэднюю ўмову для асваення рабочым класам інтэрнацыянальных задач сваёй барацьбы. Ён падкрэсліваў, што "сацыял-дэмакратыя як партыя пралетарыята, ставіць сваёй станоўчай і галоўнай задачай садзеянне самавызначэнню не народаў і нацый, а пралетарыята ў кожнай нацыянальнасці… і толькі ў асобных, выключных выпадках мы можам выстаўляць і актыўна падтрымліваць патрабаванні, якія ідуць у накірунку стварэння новай класавай дзяржавы…" [3, с. 233]. У першай праграме партыі (у яе пункце 9) права на самавызначэнне прызнавалася "за ўсімі нацыямі, якія ўваходзяць у склад дзяржавы", у самым агульным выглядзе, без спробы прадугледзець наступствы рэалізацыі гэтага права на практыцы [7, с. 62]. Аднак ужо тады Ленін прызнаваў магчымасць выхаду нацыянальных пытанняў "на авансцэну палітычнай драмы", што неўзабаве і адбылося – як у самой Расіі, так і ў суседніх еўрапейскіх краінах. Прычым, з часу першай расійскай рэвалюцыі нацыянальныя праблемы выйшлі на авансцэну палітычнага жыцця з такой сілай, што сталі яго пастаяннай з'явай і прымусілі партыю бальшавікоў займацца імі амаль няспынна, удакладняючы і паглыбляючы свае першапачатковыя праграмныя погляды па гэтых пытаннях. У час першай сусветнай вайны, калі Ленін прыйшоў да вываду аб пачатку агульнага крызісу капіталістычнай сістэмы і яе блізкім краху, ён уключыў нацыянальную барацьбу прыгнечаных народаў у сваю канцэпцыю сацыялістычнай рэвалюцыі, якую ўзяўся тады распрацоўваць у якасці аднаго з яе кампанентаў. "Сацыялістычная рэвалюцыя ў Еўропе *не можа быць* нічым іншым, як выбухам масавай барацьбы ўсіх і ўсялякіх прыгнечаных і незадаволеных," – пісаў Ленін, і адносіў да ўдзельнікаў гэтай барацьбы нацыянальна прыгнечаныя народы. А ўжо авангард рэвалюцыі, перадавы пралетарыят, узначаліць гэту масавую барацьбу з неаднолькавымі для ўсіх яе ўдзельнікам мэтамі і накіруе яе супраць капіталізма [8, с. 54 – 55]. Менавіта дзеля таго, каб выканаць гэту кіруючую ролю, перадавая частка рабочага класа мусіла прызнаць права прыгнечаных нацый на самавызначэнне.

Устанавіўшы месца ідэі аб праве народаў на самавызначэнне ў ленінскай канцэпцыі сацыялістычнай рэвалюцыі, пяройдзем да больш грунтоўнага разгляду гэтага цэнтральнага звяна яго праграмы па нацыянальным пытанні, знакамітага, але пераўтворанага ў штамп яго паслядоўнікамі і няўважлівымі крытыкамі. Такі разгляд тым болей неабходны, што ў час распрацоўкі Леніным канцэпцыі сацыялістычнай рэвалюцыі названая ідэя была ўжо дапоўнена пастулатам аб магчымасці палітычнага аддзялення ад Расіі прыгнечаных народаў і стварэння імі самастойных дзяржаў. Гэта адбылося праз 10 год пасля ўключэння яе ў партыйную праграму, на Паронінскай нарадзе ЦК з партыйнымі работнікамі 1913 г. [7, с. 447].

У кантэксце зразумелага імкнення бальшавіцкай партыі весці барацьбу на шырокай агульнарасійскай палітычнай арэне гэты пастулат – самавызначэнне народаў аж да аддзялення – выглядае парадоксам і стварае ўражанне яго нелагічнасці. Аднак справа якраз у тым, што Ленін лічыў адстойванне права прыгнечаных народаў на самавызначэнне і стварэнне ўласных дзяржаў сродкам заваявання іх даверу, неабходнага, каб забяспечыць іх выбар на карысць лучнасці з вялікай дзяржавай, у якой праводзіцца гэта нацыянальная палітыка [1, с. 285; 8, с. 22, 44 – 45]. Ідэалам, да якога належала імкнуцца, канчатковай мэтай барацьбы сацыялістычнай партыі за вырашэнне нацыянальнага пытання, адпаведна Леніну, заставалася не стварэнне нацыянальных дзяржаў, а "паскоранае збліжэнне і зліццё нацый, якое завершыцца адміраннем дзяржавы" [8, с. 22]. Дзеля гэтай канчатковай мэты сацыялістам прыгнятаючых нацый належала ў сваёй дзейнасці націскаць на свабоду аддзялення, а сацыялістам прыгнечаных нацый, наадварот, на свабоду злучэння нацый. У выніку такой каардынацыі, па

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Леніну, будзе забяспечана здольнасць працоўных мас усіх нацый весці сумесную барацьбу супраць капіталізма, за сацыялізм.

Такім чынам, ідэя аб праве прыгнечаных нацый на самавызначэнне засталася падпарадкаванай інтарэсам барацьбы за сацыялізм пасля яе дапаўнення пастулатам аб магчымасці палітычнага аддзялення. Гэтыя інтарэсы заўсёды ставіліся бальшавікамі вышэй інтарэсаў барацьбы за нацыянальнае самавызначэнне, што неаднойчы падкрэсліваў Ленін [3, с. 239; 8, с. 44 – 45; 9, с. 251, 352], а потым і Сталін, які па ленінскай ініцыятыве пачаў у партыі спецыялізавацца на пытаннях нацыянальнай палітыкі [10, с. 32; 11, с. 265].

Аднак падпарадкаванне дэмакратычнай па сваёй сутнасці нацыянальнай барацьбы, уключаючы і барацьбу за стварэнне нацыянальнай дзяржаўнасці, інтарэсам барацьбы за сацыялізм загадзя не здымала ўсіх калізій ні ў адносінах паміж грамадскімі рухамі і партыямі шматнацыянальнай краіны, меўшымі адпаведна розныя мэты, ні нават у адносінах паміж партыйным кіраўніцтвам і мясцовымі арганізацыямі самой бальшавіцкай партыі, якія дзейнічалі ў нацыянальных раёнах. Яно пакідала адкрытым пытанне аб той кампетэнтнай рашаючай інстанцыі, якая ў кожным канкрэтным выпадку ўстановіць, ці адпавядае барацьба за нацыянальныя інтарэсы інтарэсам барацьбы за сацыялізм. Няяснымі заставаліся і крытэрыі, меркі такой экспертызы. Першае з гэтых пытанняў вырашыў ЦК бальшавіцкай партыі на Паронінскай нарадзе 1913 г., і вырашыў яго проста, аддзяліўшы ў прынятай рэзалюцыі права на самавызначэнне ад мэтазгоднасці яго рэалізацыі, і прысвоіўшы партыі статус інстанцыі, якая рашае пытанне аб мэтазгоднасці. Не прыгнечаны народ праз свае нацыянальныя арганізацыі, а РСДРП будзе вырашаць пытанні аб мэтазгоднасці рэалізацыі права на самавызначэнне пэўнага народа ў канкрэтнай сітуацыі. Партыя будзе вырашаць яго “з пункта гледжання інтарэсаў усяго грамадскага развіцця і інтарэсаў класавай барацьбы пралетарыята за сацыялізм” [7, с. 447]. Відавочна, што такі валюнтарысцкі падыход быў магчымы толькі ў строга цэнтралізаванай і пабудаванай на ўнітарнай аснове партыі – якраз у такой, якую з самага пачатку ствараў Ленін са сваімі прыхільнікамі.

Аднак і само бальшавіцкае кіраўніцтва мела патрэбнасць у нейкім аб’ектыўным крытэрыі для вынясення рашэнняў аб падтрымцы ці непадтрымцы нацыянальнай барацьбы ў кожнай канкрэтнай сітуацыі, каб зменшыць верагоднасць уласных памылак, аўтарытэтна арыентаваць партыйны актыў і пазбегнуць непажаданых канфліктаў з нацыянальнымі рухамі. Вывучаючы працы Маркса, Энгельса, Каўцкага аб еўрапейскіх нацыянальных рухах, палемізуючы з польскімі сацыялістамі, Ленін прапанаваў такі крытэрый. Ён паказаў на неабходнасць улічваць канкрэтны змест гістарычнай эпохі, якую перажывае нацыянальна прыгнечаны народ, а значыць – і характар задач яго гістарычнага развіцця. Усходняя Еўропа разам з Расіяй і Азіяй у пачатку XX стагоддзя перажывалі эпоху буржуазна-дэмакратычных рэвалюцый, для якіх характэрныя “імкненні да стварэння нацыянальна-незалежных і нацыянальна-адзіных дзяржаў” [1, с. 269]. У гэтых краінах, пісаў Ленін, рэвалюцыйная рабочая партыя можа падтрымліваць нацыянальна-дэмакратычны рух прыгнечанай нацыі, паколькі ён аслабляе буржуазію пануючай нацыі. Тым самым рабочы клас і яго рэвалюцыйная партыя ў такіх краінах рашаюць не толькі задачу завяршэння буржуазна-дэмакратычных пераўтварэнняў у сваёй айчыне, але і дапамагаюць сацыялістычнай рэвалюцыі ў тых краінах, дзе яна ўжо наспела [2, с. 260 – 261].

Да ліку краін, дзе айчына “яшчэ не праспявала сваёй гістарычнай песні”, Ленін адносіў і Беларусь. Ён пісаў у канцы 1916 г., што “для ўкраінцаў і беларусаў, напрыклад, толькі чалавек, які ў марах жыве на Марсе, мог бы адмаўляць, што тут яшчэ няма завяршэння нацыянальнага руху, што абуджэнне мас да авалодання роднай мовай і яе літаратурай – (а гэта неабходная ўмова і спадарожнік поўнага развіцця капіталізма..) – тут *яшчэ* адбываецца” [8, с. 89]. Заўважым, што Ленін зрабіў гэта заключэнне, добра валодаючы матэрыялам аб сацыяльным і нацыянальным становішчы беларускага народа [12, с. 154 – 156].

Прызнанне за прыгнечанымі народамі права на самавызначэнне аж да іх аддзялення і стварэння нацыянальных дзяржаў цягнула за сабой і пастаноўку пытання аб формах узаемаадносін будучых новых дзяржаў, а таксама іх адносін з былой метраполіяй. Лагічна было б у

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

выніку яго пастаноўкі чакаць заключэння аб тым, што гэта пытанне будзе належаць кампетэнцыі саміх суверэнных дзяржаў, калі яны ўзнікнуць. Але бальшавікі і тут не дапусцілі неабачлівасці. Да таго часу Ленін выяўляў гатоўнасць прызнаць за нацыянальнымі раёнамі толькі нацыянальна-тэрытарыяльную аўтаномію, ды і тое толькі "ў асобных, выключных выпадках" [3, с. 105]. У праграме партыі гэта пытанне наогул было абыдзена. Толькі праз 10 год, пад уплывам абвастрэння нацыянальных праблем у Расіі і ў суседніх еўрапейскіх краінах, Ленін і ЦК бальшавіцкай партыі прызналі аўтаномію нацыянальных раёнаў у якасці пажаданай формы палітычнага ўладкавання дэмакратычнай дзяржавы [13, с. 58; 7, с. 446]. Але і цяпер, нават пасля Паронінскай нарады, Ленін працягваў цвёрда выказвацца супраць больш высокай формы нацыянальна-палітычнага пераўладкавання расійскай дзяржавы – супраць федэрацыі суверэнных нацыянальных рэспублік. Гэту пазіцыю ён матываваў традыцыйнымі для марксізма аргументамі – неабходнасцю для рабочага класа мець як мага шырэйшае поле барацьбы і нежаданнем падоўжыць яго шлях да сацыялізма [3, с. 105; 13, с. 143–144].

Аднак у час першай сусветнай вайны, прыйшоўшы да заключэння аб хуткім наступленні сацыялістычнай рэвалюцыі ў Еўропе і дэмакратычнай – у Расіі, Ленін істотна змяніў свае погляды па гэтым пытанні. Да іх перамены Леніна прывяла ахапіўшая яго трывога ў сувязі з адставаннем сацыялістаў ад шырокага патоку рэвалюцыйных сіл, у тым ліку і дэмакратычных нацыянальна-вызваленчых, якія па гэтай прычыне былі здольныя затрымаюцца на дэмакратычным этапе рэвалюцыі, апынуцца адведзенымі ўбок ад галоўнай, па яго перакананні, мэты – рэвалюцыйнага штурмуа ўлады буржуазіі. Каб пазбегнуць гэтай небяспекі, перахапіць і ўзначаліць масы, якія стыхійна рэвалюцыянізуюцца, сацыялістам неабходна было ўзначаліць уўсе плыні дэмакратычнай барацьбы. У гэтых умовах, на думку Леніна, федэрацыя народаў, якія вызваляюцца ад нацыянальнага ўціску, магла з'явіцца "адзіным шляхам да поўнага дэмакратычнага цэнтралізма" і адной з задач сацыялістычнай рэвалюцыі там, дзе яна наспела [2, с. 255–256, 262–263]. Ленін сфармуляваў гэтыя погляды ў тэзісах "Сацыялістычная рэвалюцыя і права нацый на самавызначэнне" ў пачатку 1916 г. і з гэтага часу пачаў глядзець на федэрацыю народаў, якія вызваляцца ад нацыянальнага ўціску, як на верагодную форму, этап пераходу да "непазбежнага зліцця нацый".

Праз год Ленін атрымаў магчымасць упэўніцца, што партыя не паспявае за развіццём яго поглядаў па праблеме палітычнага самавызначэння народаў – якраз тады, калі ён вылучыў лозунг пераходу ад дэмакратычнага этапа рэвалюцыі ў Расіі да сацыялістычнага. Наспеўшае ў Расіі нацыянальнае пытанне абмеркавала VII (Красавіцкая) партыйная канферэнцыя 1917 г., на якой Ленін, аднак, не адважыўся паставіць пытанне аб федэрацыі. Справа ў тым, канферэнцыя выявіла моцныя разыходжанні ў партыі па нацыянальным пытанні. На ёй было пастаўлена два даклады: падрыхтаваны Леніным даклад Сталіна і даклад Пятакова, і адпаведна два праекты рэзалюцыі. У дакладзе і ў праекце рэзалюцыі Пятакова, выступіўшага ад імя секцыі канферэнцыі па нацыянальным пытанні, барацьба за стварэнне нацыянальных дзяржаў аб'яўлялася перажыткам даімперыялістычнай эпохі, накіраваным супраць сацыялізма, і таму утапічным і шкодным. У яго праекце адстойвалася ідэя абласной нацыянальнай аўтаноміі як задача дэмакратычнага этапа рэвалюцыі, але сапраўднае, поўнае вырашэнне нацыянальнага пытання звязвалася з сусветнай сацыялістычнай рэвалюцыяй, якая пройдзе пад лозунгам "прэч граніцы!" [14, с. 281 – 282]. У ленінска-сталінскім праекце рэзалюцыі, наадварот, акцэнтавалася прызнанне за ўсімі нацыямі, якія ўваходзілі ў склад Расіі, права на свабоднае аддзяленне і стварэнне самастойных дзяржаў. Толькі прызнанне гэтага права разглядалася як мера, здольная забяспечыць поўную салідарнасць рабочых розных нацый і сапраўднае збліжэнне нацый. Разам з тым, амаль даслоўна паўтараючы рашэнне Паронінскай нарады, ленінска-сталінская рэзалюцыя падзяліла права на аддзяленне і пытанне аб мэтазгоднасці аддзялення ў кожным канкрэтным выпадку, і гэтак жа пакінула за партыяй права рашаць гэта апошняе пытанне [14, с. 251 – 252].

За рэзалюцыю Сталіна – Леніна была пададзена большасць галасоў – 56, за рэзалюцыю Пятакова – толькі 11. Аднак вялікая частка ўдзельнікаў канферэнцыі – 21 чалавек – пад-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

трымалі дэлегата ад Тыфліскай арганізацыі Ф. Махарадзе, які выступіў у духу даклада Пятакова, супраць прызнання права на аддзяленне, але прапанаваў ніякага рашэння не прымаць на той падставе, што ленінска-сталінская пастаноўка нацыянальнага пытання з'яўляецца для партыі новай [14, с. 227]. Гэты ж дэлегат звярнуў увагу на тое, што ўзнікшыя ў ходзе абмеркавання нацыянальнага пытання разыходжанні супадаюць з лініяй нацыянальнага прадстаўніцтва на канферэнцыі: "Надзвычай характэрны той факт, – сказаў ён, – што тыя з прысутных на канферэнцыі таварышаў, якія ўпершыню тут абмяркоўвалі нацыянальнае пытанне і якія самі з'яўляюцца прадстаўнікамі прыгнечаных нацый, амаль што ўсе адзінадушна прыйшлі да рашэння, якое фармуляваў тут т. Пятакоў" [14, с. 225]. Гэта сітуацыя ў поўную сілу праявіцца пазней, калі ўстане пытанне аб савецкай нацыянальнай дзяржаўнасці. Відавочна, яна сведчыла, з аднаго боку, аб нежаданні бальшавікоў з нацыянальных раёнаў аддаляць пераход сваіх народаў да сацыялізма, а з другога – і аб іх апасенні прайграць палітычнае спаборніцтва нацыянальным партыям на этапе нацыянальна-дэмакратычнай рэвалюцыі.

У той самы момант, калі завяршалася Красавіцкая канферэнцыя бальшавікоў, Расійская шматнацыянальная дзяржава рэальна ўступіла ў перыяд свайго "распаўзання" па нацыянальных швах з перспектывай поўнага яе распаду. Значную частку сваёй тэрыторыі яна страціла ў ходзе вайны, там раслі нацыянальныя, сепаратысцкія ў адносінах да Расіі рухі, іх ва ўласных інтарэсах ахвотна падтрымлівала Германія, і ўсё гэта рабіла вельмі праблематычным вяртанне гэтых тэрыторый у склад "единой и неделимой" Расіі пасля вайны. Нават на суседніх неакупіраваных тэрыторыях пачаўся працэс у тым жа накірунку: узнікшыя тут нацыянальна-дэмакратычныя і сацыялістычныя арганізацыі патрабавалі аўтаноміі для сваіх абласцей разам з дэмакратычным пераўладкаваннем усёй расійскай дзяржавы. Федэрацыя нацыянальных абласцей, якія на вачах аддаляліся ад Расіі, ва ўзнікшай сітуацыі набывала абрысы найбольш рэалістычнага праекта ўратавання адзінства пасляваеннай і паслярэвалюцыйнай Расіі, яе палітычнага пераўладкавання, якое б забяспечыла больш высокі ўзровень яе тэрытарыяльна-палітычнай стабільнасці. З пачатку лета 1917 г. Ленін, відавочна, пачаў улічваць гэты бок свайго праекта: магчымасць яго выйгрышнага выкарыстання як тактычнага сродку ў барацьбе з расійскімі дэмакратычнымі партыямі, якія адкладвалі рашэнне нацыянальнага пытання да Устаноўчага сходу, з нацыянальнымі партыямі, а таксама як сродку, дазваляўшага перахапіць ініцыятыву ў гэтым пытанні ў партыі эсэраў – адзінай расійскай палітычнай партыі, якая да таго часу выстаўляла федэратыўную праграму [гл. 3, с. 235; 15, С. 128–129, 161; 16, с. 17–28].

Хаця Ленін пасля Красавіцкай канферэнцыі мусіў улічваць наяўнасць моцнай унутрыпартыйнай апазіцыі яго праекту нацыянальнага самавызначэння, але ж, з другога боку, бачыў і тое, што яго праект аказаўся ў партыі найбольш уплывовым. Гэта акалічнасць разам з уласнай ацэнкай сітуацыі ў Расіі як працэсу фарміравання агульнанацыянальнага крызісу ва ўмовах неспыняўшайся вайны, падганяла Леніна, штурхала яго да радыкалізацыі пазіцыі па нацыянальным пытанні. Летам 1917 г. ён вынес сваю ідэю аб федэрацыі народаў, якія палітычна аддаляюцца ад Расіі, у пазапартыйныя сферы, дзе выкарыстоўваў яе як элемент антываеннага курса бальшавікоў. Так, у наказе дэпутатам, якія выбіраліся ў савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў у маі 1917 г., ён пісаў, што дэпутат бальшавікоў – за ўсеагульны мір на аснове вызвалення «ўсіх прыгнечаных або няпоўнапраўных народнасцей», за тое, каб велікаросы не трымалі гвалтам у сваёй дзяржаве «ні аднаго народа». «Велікаросы прапануюць братэрскі саюз усім народам, каб скласці агульную дзяржаву на добраахвотнай згодзе кожнага асобнага народа», – пісаў ён і канкрэтызаваў далей, што «ўсе народы без выключэння» змогуць «рашаць цалкам свабодна, ці хочуць яны жыць у асобнай дзяржаве або ў саюзнай дзяржаве з кім заўгодна» [17, с. 41]. Ідэю аб Расіі як «саюзе свабодных рэспублік» Ленін развіваў у сваёй «Прамове аб вайне» на І Усерасійскім з'ездзе саветаў рабочх і салдацкіх дэпутатаў у чэрвені, у якой крытыкаваў палітыку Часовага ўрада ў адносінах да Фінляндыі і Украіны як анэксіянісцкую За тое, каб перашкодзіць пераўтварэнню Расіі ў саюз свабодных рэспублік, «рабочыя і сялянскія масы ваяваць не будуць», – сцвярджаў ён на з'ездзе [17, с. 286]. Правільна зразумець гэтыя выказванні можна толькі ў тым кантэксце, у якім яны гучалі кожны раз

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

– у кантэксце прапаганды рэвалюцыйнага выхаду з вайны. Пры такім іх разглядзе заўсёды выяўляецца іх тактычны і кан'юнктурны характар. Што ж да афіцыйнай прынцыповай пазіцыі партыі па нацыянальным пытанні, то яна не змянілася пасля VII (Красавіцкай) партыйнай канферэнцыі і, як вядома, федэрацыі вызваленых народаў не прадугледжвала. Але фармальна членаў партыі абавязвала праграма 1903 г., у якой ідэя аб праве нацый на самавызначэнне была пастаўлена ў самым агульным выглядзе. У новай сітуацыі, што склалася пасля лютага 1917 г., гэта стварала магчымасці для розных яе інтэрпрэтацый.

Яшчэ Паронінская нарада паставіла перад будучым з'ездам партыі пытанне аб распрацоўцы праграмы па нацыянальным пытанні, Красавіцкая канферэнцыя – аб распрацоўцы новай агульнай праграмы. Аднак УІ з'езд партыі ў жніўні 1917 г. не здолеў рашыць гэту задачу і адклаў яе да наступнага чарговага з'езда [7, с. 593]. Аднак пры ўсіх мадыфікацыях праграмнага палажэння аб праве нацый на самавызначэнне, праведзеных да таго часу па ініцыятыве Леніна, было відавочна, што бальшавікі пад яго кіраўніцтвам напярэдадні прыходу да ўлады не збіраліся пакідаць прыгнечаныя народы іх уласнаму лёсу. Наадварот, ідэя самавызначэння народаў разглядалася іх пераважаючай большасцю як сродак, здольны вярнуць ужо адпаўшыя народы і не дапусціць выхаду з аганізаваўшай імперыі новых.

**Abstract.** On the basis of Lenin’s works and the documents of the CPSU the paper studies the evolution of Lenin’s views on the problem of national self-determination and estimates their influence on the policy of the party in the Pre-October period.

**Літаратура**

1 Ленин В. И. Полн. собр. соч. – Т. 25.
2 Ленин В. И. Полн. собр. соч. – Т. 27.
3 Ленин В. И. Полн. собр. соч. – Т. 7
4 Ленин В. И. Полн. собр. соч. – Т. 26.
5 Маркс К. и Энгельс Ф. Соч. – Т. 4
6 Маркс К. и Энгельс Ф. Соч. – Т.35
7 КПСС в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК (1898 – 1986). Т. 1. 1898 – 1917. – 9-е изд. – М.: Политиздат, 1983.
8 Ленин В. И. Полн. собр. соч. – Т. 30.
9 Ленин В. И. Полн. собр. соч. – Т. 35.
10 Сталин И. В. Сочинения. – Т. 4.
11 Сталин И. В. Сочинения. – Т. 5.
12 Белявцев В. И. В. И. Ленин и Белоруссия – Мн.: Беларусь, 1978.
13 Ленин В. И. Полн. собр. соч. – Т. 24.
14 Седьмая (Апрельская) Всероссийская конференция РСДРП(б). Петроградская общегородская конференция РСДРП(б). Апрель 1917 года. Протоколы. – М.: Политиздат, 1958.
15 Леонов С. В. Рождение советской империи. 1917 – 1922 гг. – М.: МГУ, 1997.
16 Жданова И. А. Проблемы федеративного устройства государства в Февральской революции 1917 г. /Вопросы истории. – 2007. – № 7.
17 Ленин В. И. Полн. собр. соч. – Т. 32.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступило 9.03.09

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ